# Веснік Камароўкі

Інфармацыйны бюлетэнь кааліцыйных дэмакратычных сіл Савецкага раёна №8(2) чэрвень 2007

**тэма нумару**

## Канец гандлёвым ільготам, або Нам удалося паўтарыць шлях Бірмы

*З 21 чэрвеня беларускі экспарт у краіны ЕС згубіў ільготы. Стандартныя гандлёвыя мыты, вышэйшыя за льготныя на 10%, пашыраюцца на беларускі экспарт тэкстылю, мэталу і драўніны. Рашэнне Еўракамісіі абумоўленае парушэннямі правоў незалежных прафсаюзаў. У выніку бюджэт рэспублікі будзе штогод пазбаўляцца, па розных ацэнках, 120 – 400 млн. еўра.*

Гаворка не пра эканамічныя санкцыі, але сістэму прэферэнцый, нешта падобна на прэмію, якой заахвочваюцца ўрады краін, што абавязуюцца не парушаць правы чалавека, у тым ліку правы прафсаюзаў, і сумленна іх выкоўваюць.

У нашым выпадку адмена сістэмы прэфрэнцый значыць, што аніхто апрача ўлады адказнасці за лёс гэтай прэміі ня мае, ані зламыснікі з незалежных прафсаюзаў Беларусі, ані нейкія еўрапейскія ворагі, як то імнецца выставіць старшыня Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі Л. Козік. Атрымаць прэмію ад выканання ўстаноўленых правілаў ці згубіць яе – дабравольны выбар ураду. Як выявілася, дабравольны выбар цяперашніх уладаў – пагоршыць эканамічнае становішча шматлікіх прадпрыемстваў, а значыць простых работнікаў праз невыкананне ўзятых на сябе абавязкаў.

“Калі Беларусь пагадзіцца выконваць 12 парадаў Камісіі па даследванні Міжнароднай арганізацыі працы (МАП), то маніторынг будзе спынены. Калі ж беларускі ўрад праігнаруе парады МАП, дык краіна апынецца перад фактам скасавання прэферэнцый”, – папярэджваў супрацоўнік Еўракамісіі ў гандлёвых пытаннях Б. Лефор.

За ўсю 36-гадовую гісторыю існавання Еўракамісіі толькі адна краіна – Бірма – у 1999 г. была пазбаўленая сістэмы Агульных прэферэнцый. Усталяваная ў Бірме ваенная дыктатура прыкоўвала людзей да станкоў ланцугамі, а прафсаюзных лідараў выракала на смерць. Па словах лідэра Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў Аляксандра Ярашука, наш рэжым больш цывілізаваны: зрабілі тыя ж самыя ланцугі, але ў форме папяровых кантрактаў. Правы працоўных задушаюцца таксама патрабаваннем юрыдычнага адрасу ад прафсаюзных арганізацыяў, чаго дамагчыся вельмі складана.

Як выглядае, улады дужа баяцца арганізаванага працоўнага руху і незалежных прафсаюзных арганізацый. Апавядаць пра здзекі чыноўнікаў гарвыканкамаў і службаў юстыцыі з лідараў арганізацый незалежнага прафсаюзу можна доўга.

У Беларусі рэжым практычна пазбавіў работнікаў палітычных правоў, задушыў іх адміністрацыйна і эканамічна, а цяпер знішчае апошнія арганізацыі незалежных прафсаюзаў. Адміністрацыя парушае закон і Канстытуцыю, пракуратура і суды пакрываюць парушэнні. А тым часам ФПБ з Козікам на чале смела заклікаць міжнародную супольнасць захаваць гандлёвыя прэферэнцыі.

Босы “дзяржаўных прафсаюзаў”, зарабляючы шматкроць болей за сярэдняга работніка, выкананнем правоў апошніх не апякуюцца. Адміністрацыя гоніць у прафсаюзы работнікаў, а кантракты душаць кожнага, хто асмеліцца правіць свабоду ў думках альбо дзеяннях. Не падыходзіш, маеш адрознае меркаванне ад афіцыйнага – прэч на вуліцу.

Нясусветная папулярнасць ФПБ пад звышразумным кіраўніцтвам Козіка пацвярджаецца… подпісамі 300 шэрагоўцаў з прафсаюзных арганізацый, што нібы падтрымалі зварот ФПБ да Еўракамісіі не пазбаўляць краіну прэферэнцый. У адной з аналітычных праграмаў БТ яны ажноператвараліся ў 300 арганізацый.

Афіцыйны ж сайт ФПБ працягнуў неверагодную арытметыку, напісаўшы, што зварот падтрымалі “розныя прафсаюзы краін Еўропы, Азіі, Амерыкі, Афрыкі, якія яднаюць больш за 320 мільёнаў чалавек”. Добра, што ня мільярдаў.

**Гудовіч Андрэй**

**транспорт**

## Стоимость проезда у соседей

Отменив льготы пенсионерам, ликвидаторам и студентам, власти вспомнили и про "обычные категории граждан". С июля снова подорожал проезд.

А КАК У НИХ?

В Украине одна обычная поездка в городском транспорте стоит 50 копеек (за эти деньги можно купить, к примеру, чупа-чупс). В переводе на наши деньги это около 215 рублей. Пенсионеры ездят вовсе бесплатно. А студенты могут сэкономить, купив месячный проездной на метро за 12,50 гривны (около 5400 рублей). Полный проездной на один вид транспорта стоит 25 гривен (около 11 тысяч беларуских рублей).

В Литве полный билетик стоит 1,10 лита (около 910 беларуских рублей, столько в Вильнюсе стоит "Сникерс"). Льготный билетик – около 455 рублей. Но студенческий проездной на месяц на два вида транспорта (в Вильнюсе есть только автобус и троллейбус) стоит всего 12 литов (около 10 тысяч). Взрослый проездной на оба вида стоит 60 литов (около 50 тысяч рублей), льготный – 30 литов. Но есть и "особо льготная категория граждан" – пенсионеры старше 80 лет, инвалиды первой группы и т. д. Им разовый талончик стоит всего 182 наших рубля.

В Польше разовый билет стоит дорого – 2,40 злотых (это почти 1800 белорусских рублей). Студенческий, соответственно, половину – 900 наших рублей. Но в Польше по разовым билетикам ездят разве что туристы. Ведь полный проездной на месяц на все виды стоит всего 60 злотых (около 45 тысяч наших), льготный – 50%. А еще можно купить проездной сразу на 3 месяца – он обойдется в 166 злотых (около124 тысяч белорусских рублей). Если разделить эту сумму на три месяца с учетом четырех поездок в день, получается, что одна поездка обойдется в… 350 рублей.

**По материалам “КПБ”**

**акцыя**

## Супраць разбурэння Гародні

10 чэрвеня ў Менску адбылася інфармацыйная акцыя моладзевай арганізацыі “Ініцыятыва” у абарону гістарычнай часткі Гародні. Ля 30 актывістаў, адзетых у майкі з надпісам “Абаронім старую Гародню”, раздалі мінакам некалькі тысяч лістовак, дзе змяшчалася форма звароту да прэзідэнта і розных дзяржструктур з патрабаваннем разабраца ў незаконнай “рэканструкцыі” горада. Удзельнікі руху “Камароўка” ўдзельнічалі ў распаўсюджванні лістовак ля Камароўскага рынку.

Нагадаем, што цэлы гістарычны квартал Гародні, гораду, у якім захавалася найвялікая плошча старых забудоваў, зараз пад пагрозай знічтажэння мясцовымі ўладамі. Вялікі клопат выклікае будаўніцтва магутнай магістралі праз цэнтр Гародні.

Шмат гістарычнай забудовы ўжо зруйнавалі. Першай ахвярай стала старая галоўная плошча, дзе вырубілі два гістарычныя скверы. А паколькі змены ў генплане ўтойваюцца, то невядома, што будзе наступным.



Былы галоўны архітэктар Гарадзенскай вобласці Уладзімір Ісачанка, што падзяліўся сваймі разважаннямі з Еўрапейскім радыё, ўпэўнены, што гарадзенскія ўлады парушаюць генеральны план рэканструкцыі гораду. “Усё пайшло наперакасяк. Замест таго, каб ачысціць ад праезду непатрэбнага для цэнтра горада транспарта, яго яшчэ больш узмацнілі…Там неабходна было прыбраць транспартныя лініі і пусціць іх у абыход... Гістарычную частку горада трэба захоўваць, а не аднаўляць! Рабіць шырокія вуліцы па чатыры паласы руху ня варта. Іх трэба рабіць вакол. Яны ж прабіваюцца міма старых замкаў, манастыроў, сінагог, міма ўнікальнай Гараднічанкі”

Шмат якія дзечы культуры й навукі выказалі сваю вялікую заклапочанасць становішчам. “У мяне такое адчуванне, што усё гэта робіцца свядома, каб пазбавіць людзей сувязі з продкамі”, – выславіла вядомы бард Кася Камоцкая.

**Гудовіч Андрэй**

### Шаноўныя чытачы!

Рэдакцыя бюлетэню апякуецца вашымі прапановамі наконт зместу наступных нумароў.

Свае артыкулы, водгукі й пажаданні, паведамленні й заўвагі просім дасылаць на электронную скрыню **RuchKamarouka@gmail.com**

З павагай, калектыў “Весніка Камароўкі”